Валянцінкай

# ПРЫЙШОЎ... ПАЙШОЎ

...Пра тое, што ў іх гарадок едзе хтосьці з начальства і тут будзе прымаць мясцовых, Фадзеевіч пачуў ад суседкі. Ёй — на базары бабы сказалі. Яны ж ведалі, што прыём той пачнецца «зранку», у чацвер, у выканкаме.

Дапытвацца ў суседкі, хто прыедзе, хто канкрэтна будзе прымаць, сэнсу не мела: для яе (Фадзеевіч ведаў) што дэпутат, што дэлегат... Адно слова — начальства. А калі яно, разважаў, насамрэч едзе сюды, калі для тутэйшага насельніцтва спецыяльна ладзіць прыём, значыць, падысці трэба: у яго ж і пытанні якраз, і час зараз мае.

Так што ранкам таго чацвярга ён старанна пагаліўся, памыўся, выбраў у шафе ўласнаручна памытую і адпрасаваную цёмную сарочку (але з гальштукам), амаль новы касцюм; няспешна падаўся ў цэнтр.

— Вы куды гэта? — прыпыніўшыся, ветліва пыталі ў яго знаёмцы.

— Ды так... На шпацыр, — усміхаўся Фадзеевіч. Свой візіт ён загадзя вырашыў засакрэціць. На ўсялякі выпадак... Ну сапраўды: атрымаецца размова з тым начальнікам, будзе што іншым сказаць, значыць, скажа, а як не — дык нявартa і сабак дражніць.

У выканкаме ён не быў даўно, але дзверы патрэбныя знайшоў адразу. Ветліва пастукаў, зайшоў, павітаўся з людзьмі за доўгім сталом, беспамылкова «вылічыў» прыезджага. Ён тут самы важны быў: па-гаспадарску паказаў на крэсла, запрашаючы сесці, з-за стала спытаў:

— Как ваша фамилия, имя, отчество? Где живете? Что к нам привело?

Фадзеевіч назваўся (пратакол ёсць пратакол), сказаў, што пытанняў у яго аж два. Першае: мо, там, у вышэйшых кругах, прыдумалі нешта пра ўклады: у яго 18 тысяч колісь «згарэла»... Другое — па пенсіях. Вось ён, напрыклад, — трактарыстам, бульдазерыстам працаваў з 17, вучыўся завочна, стаў майстрам, галоўным механікам завода ў Нарыльску...

— Работали, значит, там? — акінуўшы ўсіх пераможным позіркам спытаў заезджы. — А к старости что — сюда потянуло?

Дзіўна: у словах яго ніякай абразы, як быццам, не было. Але яна... была — у самім голасе: яго, Фадзеевіча, тут прымалі за нейкага дзялка, хітруна, які матаўся па свеце, шукаў выгады, падымаў чужую (?) эканоміку, зарабляў (і траціў жа!) шалёныя грошы, а цяпер, можна сказаць, на халяву, на ўсё гатовае, прыехаў у ціхую заможную Беларусь і нечага тут яшчэ патрабуе!

Агаломшаны гэтым тонам Фадзеевіч разгубіўся. Хацеў быў сказаць, што тут, у Беларусі, ён нарадзіўся, што тут у сакавіку 45-га (!) загінуў бацька, што ў маці на руках засталося пяцёра — малых і вечна галодных, што блін з леташняй мерзлай бульбы быў для іх пачастункам, што ў свае няпоўныя 8 ён ужо хадзіў за плугам, у які былі запрэжаны амаль такія ж браты, што аднаму з іх (спалі, зразумела ж, як мёртвыя пасля той арбы і заняткаў у школе) пацукі пагрызлі вуха (з жыўнасці ў хаце не было нічога, нават ката), што ў 17, пасля заканчэння «фабзайні» (як называлі школы фабрычна-завадскога навучання), у яго, у іх ніхто не пытаў, дзе яны хочуць жыць і працаваць — проста сагналі ў вагоны і павезлі — на цаліну...

Яшчэ парываўся расказаць гэтым, адносна маладым людзям, што гаротніца-маці яго працавала ў калгасе «за палачкі» (грошай тады не плацілі), што падаткамі абкладалася кожная курыца і нават яблыня, што ён хацеў дапамагчы ёй выгадаваць малодшых дзяцей і вылезці з хаты-развалюхі, што для гэтага (а была ж і свая сям'я) працаваць прыйшлося па 10—13 гадзін у суткі пры мінус 50, што ёсць узнагароды, а вось здароўя — даўно няма... Дык хоць памерці б тут, на гістарычнай Радзіме, калі жыць не сабіла! Хоць дзяцей пасяліць... Каб пажылі... За яго, за братоў, дачасна памерлых...

Даўгавата, відаць, збіраўся ён з думкамі (начальства чакала), даўгавата словы шукаў. А калі, як быццам, знайшоў, уважлівыя ўбачыў, што яны не патрэбныя, бо тут пачуць яго яшчэ могуць, а вось, каб зразумець... Наўрад...

Таму, апёршыся на краёк стала, ён пaціху ўстаў, моўчкі падзякаваў, за тое, што гэтыя прыгожыя людзі тут сабраліся і... пайшоў да выхаду.

— Да куда же вы? — панеслася ўслед. Але ён не спыніўся.

— Странный какой-то...

А яно ж сапраўды — «странный» — прыйшоў, пайшоў.

...І так многа сказаў. Таму, хто ўмее слухаць.

**Валянціна ДОЎНАР.**

# ЦЯЖКАЯ СТАРАСЦЬ,
## або Хто дагледзіць бабулю без памяці?




**Дасягнуць жыцця доўгага і якаснага — рэчы розныя. Ва ўсякім разе, як паказвае практыка, працягласць жыцця павялічваецца і ў нас, а вось з якасцю ёсць праблемы нават у высокаразвітых краін.**

Прычынай зніжэння інтэлекту — дэменцыі можа паслужыць не толькі сумна вядомая хвароба Альцгеймера, але і траўмы галавы, хранічны алкагалізм, сасудзістыя парушэнні і многія іншыя праблемы нават маладога ўзросту. З цягам часу гэтыя станы прыводзяць да незваротнага працэсу зніжэння інтэлекту. Прычым калі ў 65 гадоў з ім сутыкаюцца ад 2 да 5 працэнтаў вышэйпамянёнай катэгорыі, то ў 80 — 20 працэнтаў.

— Метадаў лячэння дэменцый пакуль не існуе, — расказвае **загадчык псіхагерыятрычнага аддзялення для мужчын Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы Аляксандр ГОЛУБ.** — Аднак можна адсунуць тэрмін іх пачатку з дапамогай дасканалага лячэння захворванняў, звязаных з узнікненнем зніжэння інтэлекту. Такія схемы лячэння добра адпрацаваныя. Галоўнае — не грэбаваць імі, вытрымліваць належныя рэкамендацыі... Скажам, у дачыненні да той жа гіпертанічнай хваробы добра вядома, што не лечаны высокі ціск у 40 гадоў можа прывесці да зніжэння інтэлекту пасля 60...

Зніжэнне інтэлекту непасрэдным чынам звязана са зніжэннем памяці. Праўда, пакуль чалавек проста забываецца на пэўныя лічбы, даты, імёны, гэта можна спісаць на адсутнасць пэўнай трэніроўкі. Уласна захворванне пачынаецца са страты аўтаматычнай памяці: хворы не памятае, куды паклаў звычайныя рэчы — акуляры, нажніцы, грошы, пры гэтым абвінавачвае ў іх «знікненні» блізкіх, тых, з кім пражывае. Паступова забываецца нават тое, што здарылася літаральна гадзіну таму, чалавек перастае распазнаваць навакольных.

— На гэтым пачатковым этапе блізкія могуць пераадолець сітуацыю з дапамогай падказак, запісак, хоць захворванне ўсё роўна будзе прагрэсаваць, — тлумачыць **загадчыца псіхагерыятрычнага аддзялення для жанчын Ганна ШАМРУК.** — Аднойчы стане відавочным, што справа зусім не ў старасці, і што наспела патрэба звярнуцца да тэрапеўта, неўролага або псіхіятра. Спецыяліст у такім выпадку прызначае комплекснае лячэнне. Выпісваюцца прэпараты для паляпшэння не толькі памяці, але і ў цэлым агульнага стану. Непасрэдна ў нашу бальніцу трапляюць, як правіла, тыя, у каго зніжэнне інтэлекту суправаджаецца пэўнымі псіхічнымі расстройствамі — псіхозамі. Старыя могуць агрэсіўна паводзіць сябе, адмаўляцца ад ежы, у іх з'яўляюцца галюцынацыі, жаданне ехаць туды, дзе яны пражылі большую частку свайго жыцця і г.д. Рэзкія змены паводзінаў у быце прымушаюць сваякоў выклікаць «хуткую»...

***Калі стары чалавек не пазнае сваякоў, апошнія думаюць, што гэта натуральная прыкмета ўзросту. На самай жа справе гэта можа быць пачаткам сур'ёзнага захворвання — незваротнага зніжэння інтэлекту.***

Крызіс у развіцці дэменцыі можа справакаваць любое іншае захворванне, што называецца, ад грыпу да халецыстыту. Арганізм проста не справіцца з гэтай нагрузкай, і развіццё зніжэння інтэлекту прадэманструе «зрыў» — рэзкае пагаршэнне паводзінаў хворага.

Хваробу-правакатара будуць лячыць у спецыяльных аддзяленнях Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы і агульных псіхіятрычных аддзяленнях абласных бальніц. А для таго, каб устанавіць, ці мае канкрэтны пацыент патрэбу ў стацыянарнай псіхіятрычнай меддапамозе, будзе праведзена грунтоўнае абследаванне галаўнога мозга на камп'ютарным тамографе. Курс лячэння ва ўстанове рэспубліканскага прызначэння, дзе, дарэчы, сёлета адкрылася самастойнае псіхагерыятрычнае аддзяленне для мужчын, дапамагае пацыентам крыху лепш арыентавацца ў навакольным асяроддзі, выконваць прасцейшыя абавязкі, паводзіць сябе больш спакойна. Адначасова спецыялісты навучаюць блізкіх пацыента сумеснаму пражыванню паводле новых правілаў, паколькі галоўнае для старога чалавека з дэменцыяй — гэта догляд, а не пілюлі.

Якраз тое, што сваякі такога хворага часта не ў стане забяспечыць. І справа не толькі ў жаданні ці яго адсутнасці. Уявім сабе такую сітуацыю: сын пражывае з маці, якая, як было заўважана вышэй, мае патрэбу не ў медыцынскай дапамозе, а ў пастаянным доглядзе. Сын працуе, а, значыць, не можа кругласутачна даглядаць і абслугоўваць маці. Па сутнасці, сын застаецца сам-насам са сваёй праблемай.

— У нас ёсць выпадкі, калі мы выпісваем пацыента, паколькі ён не мае патрэбы ў медыцынскай дапамозе, а сваякі пералічваюць шэраг прычын, па якіх той павінен застацца, — кажа Аляксандр Голуб. — Некаторыя нават спрабуюць скардзіцца. Практыка паказвае, што вялікая праблема догляду старых псіхічна хворых людзей нарастае год ад году. Працягласць жыцця павялічваецца разам з колькасцю хвароб старэйшага ўзросту, а сацыяльныя службы не паспяваюць развівацца адпаведным чынам.

Здавалася б, схема аказання сацыяльнай дапамогі састарэлым людзям навідавоку. Калі стары пражывае ў сям'і, то ў той час, пакуль працаздольныя яе ўдзельнікі выконваюць свае службовыя абавязкі, нагляд за ім можа забяспечыць медсястра Чырвонага Крыжа. Або дзённыя стацыянары амбулаторных устаноў — тых жа псіханеўралагічных дыспансэраў, куды хворага можна адвезці на светлы час сутак. Усё гэта ёсць, але недастаткова. Неабходна пашыраць колькасць месцаў у дзённых стацыянарах, павялічваць колькасць персаналу па доглядзе такіх хворых у хатніх умовах. І вырашаць гэту праблему павінны як Міністэрства аховы здароўя, так і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

— Нейкі час таму мы звярталіся на адрас Мінгарвыканкама з тым, каб паскорыць чаргу на размяшчэнне нашых хворых у дамы-інтэрнаты, — тлумачыць **юрысконсульт Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы Ігар АНІШЧАНКА.** — Гаворка ішла дзесьці аб сотні чалавек. Варта прызнаць, дарэчы, што гэта праблема звязана не толькі з недахопам месцаў у падобных установах. Так, не самыя свядомыя сваякі хацелі б ізаляваць хворага, але пры гэтым атрымліваць за яго пенсію, што магчыма пры карыстанні паслугамі бальніцы, а не інтэрната. Па-другое, неабходна прызнаць чалавека недзеяздольным у судовым парадку, па-трэцяе, з моманту такога размяшчэння сваякі могуць распараджацца маёмасцю, скажам, домам, кватэрай, аўтамабілем толькі з удзелам адміністрацыі дома-інтэрната...

Згодна з Кодэксам аб шлюбе і сям'і, не толькі ўласна бацькі павінны клапаціцца пра сваіх дзяцей, але і дзеці пра бацькоў. Фактычна ў апошніх ёсць нават права адстойваць атрыманне аліментаў ад так званых несвядомых дзяцей праз суд. Але які сэнс у гэтым праве хворым старым людзям, якія часам не могуць самастойна нават апранацца? З другога боку, чаму свядомыя дзеці, якія бяруць на сябе абавязкі па доглядзе псіхічна хворых старых, павінны адмовіцца, скажам, ад работы, якая, напэўна ж, не сумяшчаецца з кругласутачным доглядам роднага чалавека? З трацяга боку, ці гатовыя медыцынскія ўстановы да адкрыцця сацыяльных ложкаў?

***У нас не развіта сацыяльная дапамога псіхічна хворым старым, што ўскладняе жыццё і ім самім, і іх блізкім.***

Пытанняў у тэме якаснай старасці значна больш, чым дакладных адказаў. Дзеля натхнення на хутчэйшы іх пошук прыгадаем беларускую казку, паводле якой калісьці моладзь пазбаўлялася старых: адводзіла ў лес і кідала там адных. Але неяк адзін сумленны сын пашкадаваў свайго родзіча і схаваў ад чужых вачэй. Бацька пасля неаднойчы дапамог сыну сваёй парадай. Суседзі падзівіліся: як хлопцу ўдаецца пазбегнуць непрыемнасцяў? Той і адкрыў тайну: даруйце, маўляў, не кінуў я бацьку. Вось з таго часу малады са старым побач жывуць...

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ПСІХІЧНАЕ ЗДАРОЎЕ — НА ДОЎГІЯ ГАДЫ

*(паводле парад псіхіятраў-герыятраў Рэспубліканскай клінічнай псіхіятрычнай бальніцы)*

- **Харчаванне павінна быць без лішкаў і дэфіцыту. Прымаць вітаміны лепей за ўсё ад выпадку да выпадку.**
- **Неабходна пераключацца на розныя віды дзейнасці на працягу дня, месяца, года.**
- **Разнастайна адпачываць.**
- **Трэніраваць памяць.**
- **Выхоўваць дзяцей на ўласным прыкладзе.**

## Крымінал, здарэнні

### ХТО ПАКРЫЎДЗІЎ ЦАРКВУ?

Ноччу невядомыя зламыснікі сарвалі дошкі цэнтральнага ўваходу ў недабудаваны храм вёскі Узнаж Светлагорскага раёна і ўкралі чатыры абразы Хрыста Збавіцеля, столькі ж — Святой Багародзіцы і адзін абраз Казанскай Божай Маці, а таксама іншы царкоўны рыштунак. Заява аб іх прапажы раніцай паступіла ў міліцыю раёна, і начальнік следчага аддзела Вячаслаў Катлярчук паведаміў нам, што ўсё скрадзенае ў выніку аператыўнай работы было знойдзена ў схованцы побач з чыгуначным пераездам, за паўкіламетра ад царквы. Пошукі зламыснікаў працягваюцца.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### ЗАБІЎ ХТО РАЗАМ ПІЎ

У вёсцы Кямелішкі Астравецкага раёна ў выніку бытавога скандалу быў забіты чалавек. Труп мясцовага жыхара, работніка Кямелішкаўскага райспажыўтаварыства, які праляжаў на парозе ўласнага дома два дні, знайшлі суседзі. Ахоўнікі парадку, убачыўшы на целе загінулага шматлікія сляды ад пабояў, прыйшлі да высновы: мужчыну забілі. Было ўстаноўлена, што некалькі дзён таму мужчына піў разам з двума маладзейшымі аднавяскоўцамі. Сабутэльнікі, як часта бывае, не сышліся ў меркаваннях, пасля чаго ўспыхнула «перапалка». У ходзе бойкі мужчына атрымаў некалькі ўдараў тапарышчам, рукамі і нагамі па розных частках цела. Убачыўшы, што гаспадар не можа адбівацца, госці пакінулі яго паміраць...

**Аляксандр СЯНЮЦЬ.**

### БРАКАНЬЕРЫ «НА ЎСЕ РУКІ»?

Супрацоўнікі ДАІ УУС Гомельскага аблвыканкама на выездзе з абласнога цэнтра спынілі машыну, у якой было знойдзена мяса дзіка. Пры аглядзе салона аўтамабіля сумесна з дзяржінспектарамі па ахове жывёльнага і расліннага свету, якія прыбылі на месца, быў знойдзены карабін замежнай вытворчасці з аптычным прыцэлам без дакументаў (магазін з патронам калібра 9,3 мм ад яго знайшлі пры аглядзе прылеглай мясцовасці), два гладкаствольныя паляўнічыя ружжы. У двух домаўладаннях мяркуемых памагатых у Лоеўскім раёне былі канфіскаваны 33 сеткі, невад, 2 пасткі для рыбы, восці, 3 лямпы-фары. Вядзецца разбор.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА

Полное наименование:

**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «УНИВЕРСАМ РИГА»**

Адрес: *г. Минск, ул. Сурганова, 50, тел./факс 331-80-15*
Ф.И.О. директора: *Кодеба Михаил Гаврилович*
Ф.И.О. гл. бухгалтера: *Черкас Ирина Александровна*
Основной вид деятельности: *сдача внаем собственного недвижимого имущества*
Единица изменения: *млн руб.*

| Наименование | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| 1. Внеоборотные активы | 190 | 13438 | 16402 |
| 2. Оборотные активы | 290 | 1432 | 1230 |
| **Баланс** | **300** | **14870** | **17632** |
| **ПАССИВ** | | | |
| 1. Капитал и резервы | 490 | 9102 | 12078 |
| 2. Обязательства | 590 | 5768 | 5554 |
| **Баланс** | **600** | **14870** | **17632** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2007 год**

| Наименование | Код строки | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1. Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 4678 | 3372 |
| 2. Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 833 | 581 |
| 3. Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | — | 301 |
| 4. Расходы на реализацию | 050 | 1654 | 753 |
| 5. Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-040-050) | 060 | 2191 | 1737 |
| 6. Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090+100+110) | 120 | -9 | 1 |
| 7. Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | -192 | -86 |
| 8. Чистая прибыль (убыток) (200-210-220) | 240 | 1271 | 1122 |

**ИНФОРМАЦИЯ ПО СОСТОЯНИЮ на 01.01.2008 года**

| Наименование | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1. Количество акций у акционеров в том числе | шт. | 151200 | 151200 |
| - у юридических лиц | шт. | 132694 | 132694 |
| - у физических лиц | шт. | 18496 | 18496 |
| 2. Начислено на выплату дивидендов | млн руб. | 70 | 60 |
| 3. Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 462,7 | 394,5 |
| 4. Кредиторская задолженность | млн руб. | 304 | 720 |
| 5. Дебиторская задолженность | млн руб. | 221 | 341 |
| 6. Среднесписочная численность работающих | чел. | 23 | 25 |

**Директор ОАО «Универсам Рига»** **М.Г. Кадеба**
**Главный бухгалтер** **И.А. Черкас**
УНП 100299678



**ИНФОРМАЦИЯ**
**о результатах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Брандко» (г. Минск, ул. Центральная, 46) за 2007 год**

Основной вид деятельности:
**Оптовая торговля алкогольной продукцией (импорт, производство алкогольной продукции).**

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2008 г.**

| Наименование показателя | Код строки | На начало года, млн руб. | На конец года, млн руб. |
|---|---|---|---|
| **АКТИВ** | | | |
| 1. Внеоборотные активы | 190 | 961 | 2 284 |
| 2. Оборотные активы | 290 | 5 985 | 6 633 |
| **БАЛАНС** | 300 | 6 946 | 8 917 |
| **ПАССИВ** | | | |
| 3. Капитал и резервы | 490 | 681 | 2 690 |
| 4. Обязательства | 590 | 6 265 | 6 227 |
| **БАЛАНС** | 600 | 6 946 | 8 917 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2007 год**

| Наименование показателя | Код строки | За отчетный период, млн руб. |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 020 | 13 742 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 7 788 |
| Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-040-050) | 060 | 2 649 |
| Сальдо операционных доходов и расходов | 120 | -7 |
| Сальдо внереализационных доходов и расходов | 160 | -268 |
| Прибыль отчетного года | 200 | 2 374 |
| Налоги, сборы и платежи из прибыли | 210 | 701 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 220 | 7 |
| Чистая прибыль (200-210-220) | 240 | 1 666 |

**Генеральный директор С.А. Лизунов**
**Главный бухгалтер О.М. Лизунова**
УНП 800002642





## Слоўнік рыбалова

### РАТЛІН

Слова «ратлін» — руская рыбалоўная слэнгавая назва гэтага воблера. Не мае нічога агульнага з англійскімі словамі «rattling» (які грукоча) і «rattle» (бразготка). Хоць сапраўды шматлікія «ратліны» маюць у сваёй канструкцыі «бразготку». Рускі тэрмін, як бачым, адбыўся ад назвы найбольш распаўсюджанага раней тыпу воблераў — «Rapala Rattlin». Дарэчы, у англамоўных краінах для гэтых воблераў выкарыстоўваюць тэрмін «Lipless» (бязлопасцевы) як правіла ў спалучэнні з «Vibrate» (вібрыраваць). Такім чынам, ратлін — бюджэтны тып воблера фінскай фірмы «Rapala» (найбольш вядомыя ратліны), карэйскай фірмы «DAM», амерыканскай «Bagley» і іншых.



Характэрнай вонкавай асаблівасцю «ратлінаў» з'яўляецца адсутнасць відавочна выражанай лопасці, якая выступае (яе ролю выконвае верхняя пярэдняя частка «спінкі» воблера), а таксама незвычайнае размяшчэнне крапежнага кольца для лёскі (на «спінцы» воблера, на адлегласці ў раёне прыкладна адной трэцяй яе даўжыні, лічачы ад насавой часткі). Першапачаткова ратлін быў створаны выключна для вертыкальнага бляшнення (у тым ліку зімовага), як вертыкальная прынада. Пазней, на яе звярнулі ўвагу спінінгісты. Зразумела, гэтая ўвага ўнесла некаторыя карэктывы, як у форму прынады, так і ў методыку яе выкарыстання, але да канца сваю вертыкальную накіраванасць гульні (пры падзенні пад уласнай вагой) ратлін не страціў і нават захаваў у першапачатковым варыянце ў некаторых мадэлях. У час бесперапыннай праводкі ратлін размяшчаецца ў вадзе пад вуглом і рухаецца спінай уперад.

Асноўная большасць ратлінаў знешне падобныя адзін на другі на 99,9 працэнта. Як правіла, усе яны маюць міндалепадобную форму. Абсталяваныя ратліны, звычайна, двума трайнікамі — першы размешчаны ў ніжняй частцы сярэдзіны «жывата», а другі — на канцы воблера. На «спінцы» знаходзіцца кольца для прывязвання лёскі. Таўшчыня корпуса ратліна звычайна складае каля 10 міліметраў. Пераважная большасць сучасных ратлінаў зроблена з рознага роду пластмасы і, як ужо было адзначана, мае ў складзе сваёй канструкцыі бразготку. Гэтак жа існуюць мадэлі з дрэва і латуні, але яны не так шырока прадстаўленыя на рынку.

Ратліны выпускаюць памерам, пачынаючы ад 3 сантыметраў даўжыні і вагой у 3,5 грама, да 12 сантыметраў і вагой 42 грамы. Таксама існуюць сапраўдныя волаты ў 26 сантыметраў даўжыні і вагой 460 грамаў. Ратліны бываюць: якія тонуць (пераважная большасць мадэляў), суспендэры і якія плаваюць. На сёння ў свеце існуе велізарная колькасць разнавіднасцяў воблераў тыпу «ратлін». Напрыклад, з пялёсткам, які круціцца тыпу «long», замацаваным замест задняга трайніка, або паўмяккі ратлін з адным трайнікам, дзе задняя частка воблера выраблена з сілікону. Адным словам, цяпер маецца мноства варыянтаў гэтага воблера, на любы густ, здольных задаволіць самага патрабавальнага рыбалова.

Ратліны вельмі ўстойлівыя на цячэнні, можна нават сказаць — неверагодна ўстойлівыя. Гэта адзіны тып воблераў, які захоўвае хоць трохі сваю «воблерную» гульню і пры свабодным падзенні прынады на дно. Асабліва гэта характэрна для мадэляў з не вельмі вялікай агрузкай «носа». Кампактнасць канструкцыі і вага большасці ратлінаў забяспечваюць ім добрыя характарыстыкі, але гэта ж абумоўлівае параўнальна больш высокую хуткасць праводкі для захоўвання стабільнай гульні.




Ратліны маюць вельмі моцную канструкцыю, якая вытрымлівае праводку ў месцах з гладкім каменным дном і праводку па ракушачніку і гальцы. З другога боку гэтая прынада вельмі зачэпістая. Калі ў вадзе ці на дне ёсць за што зачапіцца (трава, каменне, карчы, ракушкі), дык ратлін такой магчымасці «не ўпусціць». Гэта трэба мець на ўвазе пры лоўлі. Многія спінінгісты, якія маюць багаты вопыт зімовай рыбалкі, лічаць ратліны прынадай «цёплай вады», г.зн. прынадай для актыўнай рыбы — пачатак мая — кастрычнік. Праводка ратліна патрабуе большай хуткасці ў параўнанні са звычайнымі воблерамі, а гэта адпавядае вышэйазначанаму перыяду лоўлі.

## Практыка

### ДЗЕСЯЦЬ ПЫТАННЯЎ ПА ЛОЎЛІ АКУНЯ

**(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 19, 25 сакавіка.)**

***9. Ці адпуджвае акуня павадок?***

Яшчэ адно суперпапулярнае пытанне. Самае распаўсюджанае і, між іншым абгрунтаванае, меркаванне: павадок павінен быць заўсёды. Іншая справа, што яго параметры павінны строга ўлічваць тыпы прынад і асаблівасці ўмоў лоўлі. Калі, напрыклад, гаворка ідзе аб дновым джыгу і даволі высокай верагоднасці таго, што на яго возьмецца шчупак, то павадок можа і павінен быць доўгім і моцным. У выпадку з ультралайтавымі прынадамі, асабліва — з дробнымі воблерамі, павадок па сваіх параметрах (даўжыня, таўшчыня) значна больш мініяцюрны. Заўсёды ёсць магчымасць падабраць такі павадок, які ніяк не паўплывае на гульню прынады і на колькасці акунёвых заходаў на яе, але калі раптам цапне шчупак, то як мінімум з верагоднасцю 90 працэнтаў ён, дзякуй павадку, не дастане зубамі да асноўнай лёскі.

***10. Ці праўда, што на спінэрбейт ловіцца самы буйны акунь?***

Для нашага дробнага і сярэдняга акуня (вагой да 250—300 грамаў) гэтая прынада аказваецца не зусім па зубах. Таму ў многіх аматараў рыбнай лоўлі і сфарміравалася ўстойлівае меркаванне, што спінэр-бейт — гэта прынада выключна для мацёрых гарбачоў. У асартыменце некаторых амерыканскіх і японскіх фірмаў, якія вырабляюць спінэр-бейты, маюцца і малагабарытныя прынады — вагой каля 3,5—5 грамаў і з пялёсткамі не больш «Лонга» першага нумара. Вось яны выбарачна і падыходзяць на акуня вагой на 100—150 грамаў і ў складаных з-за травы і карчоў умовах паказваюць ледзь не лепшыя вынікі. Калі вы не знайшлі маленькі спінер-бейт у продажы, вы лёгка зможаце зрабіць яго сваімі рукамі. Ніякіх прынцыповых складанасцяў у гэтым няма, а станоўчы вынік не прымусіць сябе чакаць.

**Паводле матэрыялаў сайта fishinglib.info.**

### КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ

**ПРЫ ЛОЎЛІ Ў ПРАВОДКУ, каб рукі менш стамляліся, цэнтр цяжару вудачкі трэба змясціць як мага бліжэй да камля, замацаваўшы на ім свінцовую аліўку вагой у 80—100 грамаў. Агульная вага вудзілішча ад гэтага мала павялічыцца, але нагрузка на руку значна паменшыцца.**

Каб ваш рыбацкі **БАВАЎНЯНЫ КАСЦЮМ** стаў воданепранікальным, растварыце ў трох літрах вады 20 грамаў воцатнага свінцу і асобна ў такой жа колькасці вады 40 грамаў галыну. Абодва растворы змяшайце і адфільтруйце. Потым у гэтую сумесь на пяць-шэсць гадзін пакладзіце касцюм. Пасля прасушкі ён стане непрамакальным, але будзе прапускаць паветра. Для **АБУТКУ** трэба прыгатаваць спецыяльную пасту. Вазьміце пяцьдзесят грамаў парафіну, 200 грамаў натуральнага пакосту, нагрэйце на лёгкім агні і змяшайце. Да цёплага раствору дадайце 100 грамаў гумавага клею, столькі ж рыцыны і дбайна змяшайце да атрымання аднастайнай масы. Атрыманай пастай прамачыце верх і падэшву абутку.

**Для таго, каб ДАЖДЖАВЫЯ ЧАРВЯКІ сталі яскравымі, перад рыбалкай на дзень-два іх варта змясціць у скрыначку з вільготнай травой, траву змачыць слаба заваранай гарбатай.**




## Аўтаадказчык

### «КЕНГУРАТНІКІ» ЧАКАЮЦЬ «ВЕРДЫКТУ»

***Хачу паставіць на свой аўтамабіль сталёвыя дугі — гэтак званы «кенгуратнік». Ці праўда, што яго хочуць забараніць і чаму?***

**Андрэй Мароз, Жодзіна**

Сапраўды, з падобнай ініцыятывай выступіла РУП «Белтэхагляд» і накіравала адпаведную прапанову ў Дзяржаўтаінспекцыю. Канчатковае рашэнне яшчэ не прынята. Хоць у краінах Еўрапейскага саюза і нават у Расіі «кенгуратнікі» ўжо забаронены. Справа ў тым, што сталёвыя дугі, якія першапачаткова з'явіліся ў Аўстраліі для абароны аўтамабіляў ад непрадказальных кенгуру (адсюль і адпаведная назва гэтага прыстасавання), на вуліцах гарадоў ператварыліся ў забойцаў пешаходаў і асабліва дзяцей. Бо ўдар «кенгуратніка» значна мацнейшы і больш небяспечны для пешахода, чым «пацалунак» бампера. Спецыялісты з краін ЕС падлічылі, што забарона на ўстаноўку сталёвых дуг дасць магчымасць скараціць колькасць ахвяраў сярод пешаходаў у 4 разы. Такімі ж меркаваннямі кіраваліся і нашы суседзі расіяне. Што датычыцца вашага намеру прыладзіць «кенгуратнік», то нават, калі гэтае прыстасаванне і не будзе афіцыйна забаронена, у вас могуць узнікнуць праблемы з праходжаннем тэхагляду. Калі заводам-вытворцам ваша аўто не было аснашчана «кенгуратнікам», то такая аперацыя лічыцца зменай канструкцыі транспартнага сродку, а гэта самавольна рабіць катэгарычна забараняецца.



## Аўтаімпарт

### МЕНШ, АЛЕ ДАРАЖЭЙ

**Паводле звестак Дзяржаўнага мытнага камітэта, за першыя два месяцы гэтага года ў Беларусь было ўвезена 20,6 тысячы легкавых аўтамабіляў.**

Гэта на 4,4 тысячы транспартных сродкаў менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Аднак, агульны кошт імпартаваных сёлета аўтамабіляў на 10 мільёнаў долараў большы: за студзень-люты гэтага года ўвезена машын на 143,9 мільёна долараў. Асноўная частка аўтамабіляў у нашу краіну імпартавана з Германіі і Францыі. Большасць аўтамабіляў (12 629 машын амаль на 68,9 мільёна долараў) увезлі фізічныя асобы. Юрыдычныя асобы імпартавалі 8 тысяч аўто, а іх агульны кошт склаў 75 мільёнаў долараў.

## Аўтабяспека

### ПРАПУСЦІ ПЕШАХОДА

**Больш за 2 тысячы кіроўцаў транспартных сродкаў прыцягнуты да адказнасці падчас акцыі «Прапусці пешахода», якая ўжо 4 тыдні праводзіцца сталічнай Дзяржаўтаінспекцыяй.**

Ва ўпраўленні ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама нагадалі, што акцыя — бестэрміновая і ўсё яшчэ працягваецца. Таму вадзіцелям варта памятаць: за «непаважлівыя адносіны» да пешаходаў прадугледжаны штрафныя санкцыі ад 1 да 5 базавых велічынь. Прычым гэта толькі ў тым выпадку, калі кіроўца проста не прапусціць пешахода. А калі вадзіцель створыць на пешаходным пераходзе аварыйную сітуацыю, то можа страціць правы і заплаціць штраф у памеры ад 10 да 20 «базавых».

## Аўтаінфарм

### АДРАСЫ ПУНКТАЎ РЭГІСТРАЦЫІ

Да ведама аўтааматараў з Фрунзенскага і Маскоўскага раёнаў сталіцы. Зачынены пункт рэгістрацыі транспартных сродкаў на вуліцы Мантажнікаў, 7, што побач з ЦЭЦ-4. Жыхары памянёных раёнаў могуць зарэгістраваць свае аўтамабілі ў адмысловых установах на вуліцах Сярова,1, Ціміразева, 123 і ў пасёлку Баравая,1.

## Аўтаспорт

### ПАЕХАЛІ!..

**У Дзень касманаўтыкі, 12 красавіка, на Быхаўскім аэрадроме адкрыецца новы сезон спаборніцтваў па драгрэйсінгу.**

Паводле звестак арганізатараў, у гэты дзень адбудуцца не толькі традыцыйныя гонкі на дыстанцыі 402 метры, але і конкурс сярод цюнінгаваных машын, аўтавыстава, а таксама розныя спаборніцтвы сярод гледачоў. Дарэчы, уваход на аэрадром будзе бясплатны, а ўезд на легкавушцы будзе каштаваць 15 тысяч рублёў.

## Аўтаправа

### КОДЭКСАМ ПА СТРЫТРЭЙСЕРАХ

**У Аргенціне вулічныя гоншчыкі (стрытрэйсеры) аўтаматычна залічаны ў злачынцы.**

Паводле новага закона, у гэтай краіне ўдзельнікам несанкцыянаваных гонак, незалежна ад таго былі падчас спаборніцтваў аварыі ці абышлося без здарэнняў, аўтаматычна пагражае турэмнае зняволенне на тэрмін ад 6 месяцаў да 3 гадоў з пазбаўленнем правоў на 6 гадоў. Не абышлі заканадаўцы ўвагай арганізатараў такіх спаборніцтваў і механікаў, якія рыхтуюць аўтамабілі для стрытрэйсераў. Для іх прадугледжаны штрафныя санкцыі ў эквіваленце ад 3 тысяч да 5 тысяч долараў.

## Аўтадаследаванне

### ДЫЯМЕТР І РОСТ

**Доктар Фелікс Шмутцыг з аўстрыйскага інстытута Лінца выявіў залежнасць паміж ростам мужчыны і дыяметрам дыскаў ягонага аўтамабіля.**

У даследаванні доктара Шмутцыга ўзялі ўдзел амаль паўтары тысячы мужчын, рост якіх складаў ад 156 да 193 см. Дык вось, чым меншы быў уладальнік транспартнага сродку, тым большым колам ён аддаваў перавагу. Адметна, што такая «гігантаманія» зусім не ўласцівая жанчынам-вадзіцелям. Прынамсі, пра гэта сведчаць вынікі апытання 400 рэспандэнтак.

## Аўтаэксперымент

### САМ САБЕ РЭГУЛІРОЎШЧЫК

У Эстоніі праводзіцца эксперымент, падчас якога вадзіцелі грамадскага транспарту самі кіруюць сігналамі святлафора. З дапамогай спецыяльнага спадарожнікавага навігацыйнага абсталявання вадзіцель мае магчымасць не выходзячы з кабіны падоўжыць час дзеяння зялёнага святла і тым самым пазбегнуць адставання ад графіка руху.

## Аўтажарт

*Пяцігадовая дзяўчынка пытаецца ў бацькі:*

*— Тата, а да таго, як ты пазнаёміўся з мамай, хто табе падказваў, як трэба кіраваць машынай?*

